*А. А. Акушэвіч (Рэспубліка Беларусь, Мінск,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт)*

# РАЗВІЦЦЁ МЕДЫЯАДУКАВАНАСЦІ ВУЧНЯЎ: ІМІТАЦЫЯ РАБОТЫ З САЦЫЯЛЬНЫМІ СЕТКАМІ НА ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Развіццё медыяадукаванасці вучняў з’яўляецца сёння важным пытаннем, якое хвалюе вучоных, выкладчыкаў, настаўнікаў, метадыстаў, бацькоў. Гэта пацвярджаецца таксама выхадам у свет значнай колькасці публікацый, прысвечаных тэорыі, гісторыі і актуальнаму стану медыяадукацыі, падрыхтоўкай адпаведных вучэбных дапаможнікаў [1; 2; 3; 4; 5; 6; 7; 8; 9; 10]. Сярод іншага немалая ўвага надаецца рабоце ў сацыяльных сетках, навучанне якой магчыма і ў працэсе выкладання літаратуры, у тым ліку беларускай [11; 12; 13; 14].

Падчас работы з сапраўднымі сацыяльнымі сеткамі на вучэбным занятку (пры выкананні дамашняга задання) узнікаюць пэўныя складанасці і рызыкі, якія падштурхоўваюць да строгага абмежавання такой дзейнасці ў адукацыйным працэсе. Прывядзём некаторыя з іх.

1. Правядзенне значнай кольскасці часу за камп’ютарам (смартфонам, планшэтам) можа правакаваць стомленасць і адбівацца на здароўі навучэнцаў.

2. Вучні ў сацыяльных сетках могуць пераключацца з вучэбнага задання на цікавы для іх, але не заўсёды карысны кантэнт (у тым ліку дзякуючы рэкламе).

3. Вучні могуць папасці ў небяспечную сітуацыю – махлярства, уцягванне ў незаконную дзейнасць і інш. (нагадаем, што для рэгістрацыі ў некаторых сацыяльных сетках неабходна дасягнуць паўналецця).

4. Настаўнік не заўсёды можа кантраляваць, якімі рэсурсамі карыстаецца вучань падчас пошуку інфармацыі.

5. Перад педагогамі паўстае праблема праверкі выканананых вучнямі работ: крытэрыі ацэнкі, доступ да тэхнічных сродкаў, плагіят, запазычанні, аўтарскае права і інш.

6. Сацыяльныя сеткі могуць быць нязручнымі для рашэння канкрэтных педагагічных задач ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

7. За кошт выканання аднаго і таго ж задання рознымі вучнямі будзе множыцца колькасць аднатыпных старонак-адукацыйных прадуктаў неаднолькавай якасці, што стане “засмечваць” інтэрнэт-прастору, падштурхоўваць вучняў да спісвання ўжо гатовых матэрыялаў, зводзіць у зман карыстальнікаў і інш.

Нягледзячы на ўсе перашкоды імклівае развіццё сучасных інфармацыйных тэхналогій вымушае рыхтаваць вучняў да работы з

сацыяльнымі сеткамі, пэўны адукацыйны патэнцыял якіх цяжка аспрэчыць.

На наш погляд, каб пазбегнуць некаторых негатыўных з'яў у інтэрнэт-прасторы, асабліва на пачатковых этапах, варта звяртацца да імітацыі работы з сацыяльнымі сеткамі, што будзе спрыяць і развіццю чытацкай адукаванасці. Беларускі даследчык В. І. Караткевіч заўважае, што без яе сфарміраванасці ў навучэнцаў "паспяховае навучанне ў школе немагчыма" [15, с. 483].

На практыцы такі падыход на ўроках літаратуры карысны, найперш, пры характарыстыцы персанажаў твора і пры вывучэнні біяграфіі пісьменніка.

***Характарыстыка персанажаў твора.*** Пры падрыхтоўцы вучняў да характарыстыкі персанажа твора можна звярнуцца да надрукаванай старонкі, якая імітуе ўмоўную сацыяльную сетку "Персанажы беларускай літаратуры" (гл. мал. 1). Прапанаваная мадэль старонкі можа дапрацоўвацца згодна з мэтамі канкрэтнага ўрока. Фактычна, вучні запаўняюць своеасаблівую "анкету героя", якая пададзена ў форме старонкі з сацыяльнай сеткі. Пры запаўненні такой раздрукаванай умоўнай старонкі дапушчальна карыстацца інтэрнэт-рэсурсамі і/або абапірацца на вучэбны дапаможнік. Характарызаваць такім чынам можна герояў і даўняй, і сучаснай літаратуры (Вітаўт, Аліндарка, Насцечка, Эма Пшанічная, Андрэй Лабановіч і інш.). Можа ўзнікаць сітуацыя, калі нейкія пункты старонкі ўмоўнай сацыяльнай сеткі нельга раскрыць па прычыне адсутнасці ў творы патрэбнай інфармацыі. У такім выпадку вучань мусіць патлумачыць, чаму ён пакінуў іх без увагі (аднак дадумваць за аўтара факталагічныя моманты нельга).

***Біяграфія аўтара.*** Падчас вывучэння біяграфіі пісьменнікаў можна выкарыстаць надрукаваную на паперы старонку, якая імітуе ўмоўную сацыяльную сетку "Беларускія пісьменнікі" (гл. мал. 2). Задзейнічаць такую старонку мэтазгодна пры вывучэнні біяграфічных звестак пра аўтараў XVI – першай паловы XX стагоддзя (Францыск Скарына, Ян Чачот, Францішак Багушэвіч, Янка Купала, Якуб Колас і інш.).

Пасля запаўнення прапанаваных вышэй старонак неабходна абмеркаваць з вучнямі наступныя пытанні:

1. Якую інфармацыю варта размяшчаць у сацыяльных сетках?
2. Чым карысныя сацыяльныя сеткі?
3. Ці хаваецца ў сацыяльных сетках небяспека?
4. Ці можна сфармуляваць правілы карыстання сацыяльнымі сеткамі?

*Старонка сацыяльнай сеткі “Персанажы беларускай літаратуры”*

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

Узрост: ______________________

Месца вучобы: ______________________

Месца працы: ______________________

Дэвіз: ______________________

У якім творы пра мяне напісана: ______________________

Статус: ______________________

Сям’я: ______________________

*Коратка пра сябе*

*Мае сябры*

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | |

Пытанне жыцця: ______________________

Хобі: ______________________

Цытаты: ______________________

*Мае фота (малюнкі)*

| | | |
|---|---|---|
| | | |

*Апошнія допісы*

**Мал. 1. – Мадэль старонкі для друку, якая імітуе ўмоўную сацыяльную сетку “Персанажы беларускай літаратуры”**

***Старонка сацыяльнай сеткі “Беларускія пісьменнікі”***

Прозвішча, імя, імя па бацьку

______________________________

Гады жыцця: ______________________________

Месца вучобы: ______________________________

______________________________

Месца працы: ______________________________

______________________________

Дасягненні: ______________________________

______________________________

Хобі: ______________________________

Сям’я: ______________________________

______________________________

*Коратка пра сябе*

*Мае кнігі (творы)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

Цытаты: ______________________________

______________________________

______________________________

Літаратурныя напрамкі (стылі, плыні): ______________________________

______________________________

Цікавы факт: ______________________________

______________________________

*Мае допісы*

*Допісы чытачоў (крытыкаў)*

**Мал. 2. – Мадэль старонкі для друку, якая імітуе ўмоўную сацыяльную сетку “Беларускія пісьменнікі”**

Таксама настаўніку неабходна сумесна з вучнямі прааналізаваць, ці былі дапушчаны імі памылкі падчас працы з раздрукоўкамі.

Такім чынам, імітацыя работы з сацыяльнымі сеткамі на вучэбных занятках па беларускай літаратуры дапамагае развіваць чытацкую і медыяадукаванасць вучняў і адначасова вырашаць вучэбныя задачы па прадмеце. Распрацаваныя мадэлі старонак для друку, якія імітуюць умоўныя сацыяльныя сеткі, могуць выкарыстоўвацца на ўроку (ці ў якасці дамашняга задання) для характарыстыкі персанажаў твора і вывучэння біяграфіі пісьменніка.

### *Літаратура*


1. Федоров, А. В. Медиаобразование: история и теория [Электронный ресурс] / А. В. Федоров. – М., 2015. // https://ifap.ru. – Режим доступа: https://ifap.ru/library/book560.pdf. – Дата доступа: 04.04.2023.
2. Интеграция медиаобразования в условиях современной школы: сб. науч. тр. I Всероссийской науч.-практ. конф. с междунар. участием [Электронный ресурс] / А. В. Федоров [и др.]. – Москва ; Берлин, 2020. // https://ifap.ru. – Режим доступа: https://ifap.ru/library/book601.pdf. – Дата доступа: 04.04.2023.
3. Мейкшане, Т. А. Что охватывает понятие «медиаграмотность»? [Электронный ресурс] / Т. А. Мейкшане // Медиасфера и медиаобразование: специфика взаимодействия в современном социокультурном пространстве: сб. ст. – Могилев, 2019. – Режим доступа: https://elib.institutemvd.by/jspui/handle/MVD_NAM/3343. – Дата доступа: 03.04.2023.
4. Аношкова, Т. А. Медиаграмотность как навык XXI-го века в современном образовании [Электронный ресурс] / Т. А. Аношкова // Иностранные языки: инновации, перспективы исследования и преподавания: материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 21–22 марта 2019 г. – Минск, 2019. – С. 602–606. – Режим доступа: https://elib.bsu.by/handle/123456789/218925. – Дата доступа: 04.04.2023.
5. Шынгысова, Н. Т. Медиаграмотность: обзор литературы [Электронный ресурс] / Н. Т. Шынгысова, Б. А. Мусаева // Universum: филология и искусствоведение. – 2020. – №3 (71). – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/mediagramotnost-obzor-literatury. – Дата доступа: 06.04.2023.
6. Возчиков, В. А. Медиаграмотность в педагогической интерпретации [Электронный ресурс] / В. А. Возчиков, А. Ю. Арутюнян, Е. Б. Манузина, А. А. Немирич // Медиаобразование. – 2014. – №2. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/mediagramotnost-v-pedagogicheskoy-interpretatsii. – Дата доступа: 06.04.2023.
7. Fazliakhmetov, T. R. Using social media in the educational process [Электронный ресурс] / T. R. Fazliakhmetov, A. V. Danilov, G. I. Muhutdinova, N. B. Tursunova // Информатика и образование. – 2020. – 9. – С. 38–42. – Режим доступа: https://info.infojournal.ru/jour/article/view/576. – Дата доступа: 04.04.2023.
8. Дубовер, Д. Медиаграмотность. Часть 1. Как жить в медиамире [Электронный ресурс] / Д. Дубовер // https://mediasabak.org. – Режим доступа: https://mediasabak.org/media/3982c9e5-67cb-4d36-a004-44874caa4660.pdf. – Дата доступа: 04.04.2023.
9. Запрудскі, М. Урок як сродак фарміравання медыйнай пісьменнасці вучняў [Электронны рэсурс] / М. Запрудскі // https://ng-press.by. – Рэжым доступу:

https://nastgaz.by/urok-yak-srodak-farmiravannya-medyjnaj-pismennastsi-vuchnyau/. – Дата доступу: 04.04.2023.

10. Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапаможнік для настаўнікаў / М .І. Запрудскі, А. А. Палейка, А. У. Радзевіч, Т. П. Мацкевіч і інш.; пад рэд. М. І. Запрудскага. – Мінск, 2016.

11. Паўлава, Ю. С. Патэнцыял урокаў беларускай літаратуры ў развіцці медыяпісьменнасці вучняў [Электронны рэсурс] / Ю. С. Паўлава // Аксиология филологического образования в контексте подготовки педагога будущего : материалы междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 85-летию со дня рождения проф. Л. А. Муриной, Минск, 22–23 марта 2021 г. – Минск, 2022. – С. 215–220. – Режим доступа: https://elib.bsu.by/handle/123456789/282893. – Дата доступа: 04.04.2023.

12. Воронцова, К. В. Возможности социальных сетей и интернет-ресурсов при изучении русской классической литературы [Электронный ресурс] / К. В. Воронцова, Л. Ю. Кравченко // Известия ВГПУ. – 2015. – №4 (99). – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/vozmozhnosti-sotsialnyh-setey-i-internet-resursov-pri-izuchenii-russkoy-klassicheskoy-literatury. – Дата доступа: 04.04.2023.

13. Слишкевич, А. Использование социальной сети Instagram на уроках русской литературы [Электронный ресурс] / А. Слишкевич // https://ng-press.by. – Режим доступа: https://ng-press.by/2021/12/14/ispolzovanie-sotsialnoj-seti-instagram-na-urokah-russkoj-literatury/. – Дата доступа: 04.04.2023.

14. Земляник, Т. Н. Формирование медиаграмотности на уроках белорусского языка и литературы [Электронный ресурс] / Т. Н. Земляник // XIII Международ. науч.-практич. конф. «Шамовские педагогические чтения научной школы Управления образовательными системами», 23 января – 1 февраля 2021 г.: сб. статей: в 2 ч. – М., 2021. – Ч. 2. – С. 144–148. – Режим доступа: https://toipkro.ru/content/files/documents/2_tom_XIII_Shamovskie_2021_PEChAT_.pdf. pdf. – Дата доступа: 04.04.2023.

15. Караткевіч, В. І. Краязнаўчая літаратура ў аспекце функцыянальнай адукаванасці: развіццё навыкаў асэнсаванага чытання [Электронны рэсурс] / В. І. Караткевіч // Чтения имени А. С. Дембовецкого: 755-летию Могилева посвящается: сб. ст. I Междунар. науч.-практ. конф.: в 2 ч. – Могилев, 2022. – Ч. 1. – С. 484–487. – Режим доступа: http://e.biblio.bru.by/handle/1212121212/23120. – Дата доступа: 04.04.2023.